# Праэкт экалагічнага кодэкса: праца працягваецца

**Новы сістэматызаваны дакумент закліканы аб'яднаць нормы ў галіне аховы навакольнага асяроддзя, рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў і экалагічнай бяспекі. Кодэкс павінен стаць асноўным заканадаўчым актам, які рэгулюе экалагічныя праваадносіны, замяніць шэраг прыродаахоўных законаў апошніх дзесяцігоддзяў.**

Праект Экалагічнага кодэкса складаецца з 10 раздзелаў, 43 глаў і 349 артыкулаў. У дакумент увайшлі прававыя інстытуты і механізмы, закладзеныя ў законах «Аб ахове навакольнага асяроддзя», «Аб ахове атмасфернага паветра», «Аб ахове азонавага слоя», «Аб абыходжанні з адходамі» і інш. Уключаны і асобныя палажэнні кодэксаў аб зямлі, нетрах, ляснога і воднага кодэксаў, законаў «Аб раслінным свеце» і «Аб жывёльным свеце».

- Паколькі дакумент уключае палажэнні васьмі законаў і шасці заканадаўчых актаў па пытаниях аховы кампанентаў прыроднага асяроддзя, у ім аб'яднаны масіў існуючага паняційнага апарата. Гэта больш за 200 тэрмінаў і іх вызначэнняў. Таксама падчас работы па кансалідацыі і кадыфікацыі заканадаўства аб ахове навакольнага асяроддзя ў праект кодэкса ўключаны нормы 12 палажэнняў, зацверджаных пастановамі ўрада. Гэта прыменена ў адносінах да Нацыянальнай сістэмы маніторынгу навакольнага асяроддзя і ўсіх відаў маніторынгу, экалагічнага аўдыту, рэестра тарфянікаў і іх інвентарызацыі, пераліку службовых асоб Мінпрыроды і яго тэрытарыяльных органаў, якія маюць права кантраляваць галіны аховы навакольнага асяроддзя, рацыянальнага (устойлівага) выкарыстання прыродных рэсурсаў, грамадскай экалагічнай экспертызы, - расказаў начальнік упраўлення экалагічнай палітыкі, навукі і інфармацыі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя **Раман ЛАБАЗНАЎ.**

У праекце кодэкса вызначаны асноўныя мэты кантролю ў галіне аховы навакольнага асяроддзя, пералічаны дзяржаўныя органы, якія права дзяць яго ў адпаведнасці з існуючай сістэмай і актамі заканадаўства. Устаноўлены парадак кампенсацыі шкоды, прычыненай навакольнаму асяроддзю, - такі ж, як і ў дзеючым заканадаўстве.

Сярод новаўвядзенняў - парадак ліквідацыі назапашанай шкоды. Гэта комплекс мерапрыемстваў па ліквідацыі шкоды навакольнаму асяроддзю, што ўзнікла ў выніку мінулай гаспадарчай і іншай дзейнасці юрыдычных або фізічных асоб, абавязкі па ліквідацыі якой не былі выкананы або выкананы не ў поўным аб'ёме. Вызначаны і аб'екты назапашанай шкоды навакольнаму асяроддзю, кампетэнцыі органаў дзяржкіравання па ўстанаўленні парадку выяўлення, ацэнкі рэестра такіх аб'ектаў, а таксама арганізацыя работ па ліквідацыі шкоды.

Праект дакумента прайшоў першы этап узгаднення з органамі дзяржаўнага кіравання. У дапамогу Мінпрыроды для распрацоўкі праекта кодэкса Пастаянная камісія па экалогіі і прыродакарыстанні праводзіць выязныя пашыраныя пасяджэнні. Адно з іх адбылося ў мінулым кастрычніку на базе БелНДЦ «Экалогія» і датычалася перапрацоўкі адходаў.

З цягам часу практыка паказвае, што адходаў становіцца больш, а працэнт перапрацоўкі і канфіскацыі не вельмі вялікі. На базе БелНДЦ «Экалогія» і дадаткова ў рамках Саюзнай дзяржавы (мы выязджалі, напрыклад, у Ніжагародскую вобласць) вывучалі вопыт перапрацоўкі адходаў і выкарыстання другасных матэрыяльных рэсурсаў, наведвалі прадпрыемствы. Вопыт дапамагае нам убачыць тыя ці іншыя напрацоўкі, якія мы можам прымяніць тут, у Беларусі, - растлумачыла старшыня Пастаяннай камісіі па экалогіі і прыродакарыстанні Палаты прадстаўнікоў **Жанна ЧАРНЯЎСКАЯ.**

На выязных пашыраных пасяджэннях у сакавіку і чэрвені 2025 года былі абмеркаваны пытанні гідраметэаралагічнай дзейнасці, а таксама практыка прымянення заканадаўства аб асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях. Як адзначыў Раман Лабазнаў, быў сабраны вялікі масіў прапаноў з улікам практыкі прымянення дзеючых законаў. Зараз адбываецца дапрацоўка праекта кодэкса, ён рыхтуецца да паўторнага ўзгаднення, пасля чаго дакумент будзе вынесены на грамадскае абмеркаванне.

- У цэлым значных змяненняў у дзеючае заканадаўства праектам не прадугледжваецца. Гэта абумоўлена двума фактарамі: устоянай і стабільнай сістэмай заканадаўчых актаў, якія рэгулююць гэтыя пытанні, і комплекснай перапрацоўкай законаў, - падкрэсліў прадстаўнік Мінпрыроды.

**Для распрацоўкі праекта Экалагічнага кодэкса сфарміравана рабочая трупа, у якую ўваходзяць прадстаўнікі практычна ўсіх органаў дзяржаўнага кіравання, эксперты Мінпрыроды і навукоўцы.**

**Александрына ПАРШЫНА**